*Алесь Лозка*

# ТЭОРЫЯ АДЛЮСТРАВАННЯ КАЛЯНДАРНЫХ СТЫЛЯЎ У БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

У фалькларыстыцы пануе агульнае разуменне паходжання каляндарна-народных свят, якое зводзіцца да высновы, што яны маюць язычніцкія карані. Тэорыя адлюстравання каляндарных стыляў у беларускім фальклоры, якая прапанавана намі ў першыя гады XXI стагоддзя [1; 2], значна дапаўняе і тлумачыць актуальную тэму. Сутнасць яе ў наступным. Найбольш значныя святкаванні, якія асабліва ўтвараюць абрадава-паэтычныя комплексы, менавіта звязаны з адзначэннем нашымі продкамі асноўных дзён, ад якіх пачынаўся адлік у годзе. Такіх дзён у гісторыі народаў было некалькі і гэта тлумачыцца адшуканнем імі аптымальных сродкаў летазлічэння.

У храналогіі існуе паняцце каляндарнага стылю, пад якім разумеецца вызначэнне пачатку года. А **каляндарна-фальклорны стыль** – гэта вызначэнне асноўноўнага свята года ў пэўным рэгіёне і гістарычным перыядзе, якое сфарміравала адпаведны паэтычна-абрадавы і магічна-міфалагічны комплексы, што захаваліся ў памяці народа ці пісьмова зафіксаваны; гэта спосаб летазлічэння, які звязаны з асноўнай храналагічнай кропкай, ад якой пачыналі мясцовае лічэнне дзён і “летаў”, што інтэрпрэтавалася як Наваголдзе/Навалецце.

Парадаксальна, але ўпершыню нашы далёкія продкі адзначалі Новы год не зімой, а летам. Гэтая пара называлася Навалеццем і разумеецца цяпер як Купалле, якое прадстаўляе сонечны каляндар. Дарэчы, старажытныя рукапісныя кнігі падзей называюцца летапісамі, а не годапісамі, дзе ўсё пачынаецца словамі: «У лета…».

Першы сонечны каляндар з’явіўся ў Старажытным Егіпце (4 тыс. да н. э.). У ім Навалецце звязвалася з летнім сонцастаяннем і разлівам Ніла. Новы год летам (16 ліпеня) таксама адзначаўся ў племені мая, старажытных армян і інш. У мусульманскім календары лік гадам вядзецца ад “хіджры” (16 чэрвеня 622 г. па юліянскім стылі). Новы год у маі-чэрвені адзначаюць нганасанне, эвенкі Верхняга Прыамур’я – з кукавання зязюлі, з сярэдзіны лета – некаторыя іншыя народы Сібіры [3 - 5][1].

У еўрапейскай літаратуры звычайна згадваецца шэсць асноўных каляндарных стыляў, якімі карысталіся ў розны гістарычны час народы Еўропы, пачынаючы новы год з 25 снежня, 1 студзеня, 1 сакавіка, 25 сакавіка, Пасхі і 1 верасня [3, с. 395]. Іх адпаведна называюць – раждзественскі, студзеньскі, сакавіцкі, благавешчанскі, пасхальны і вераснёўскі. Упарадкоўваючы і сістэматызуючы старадаўнія акты віленскіх архіваў, выдатны архівіст і крыніцазнаўца, загадчык Цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг, член Віленскай археаграфічнай камісіі М. Гарбачэўскі робіць важныя высновы: «Амаль трэцяя частка актавых кніг Цэнтральнага архіва Вільні пісаны на лацінскай мове. У іх … лічэнне вядзецца адразу ад Богаз’яўлення, затым ад першага тыдня Вялікага посту і ад Пасхі, нарэшце, ад Пяцідзесятніцы» [6, с. 8].

Мы маем фенаменальную магчымасць, якую не маюць іншыя народы, праверыць на сваім фальклорна-этнаграфічным матэрыяле як адлюстравалася гісторыя календара ў першыя стагоддзі прыняцця хрысціянства і адказаць на пытанне, калі ж на самай справе беларусы адзначалі Новы год. Такую ўнікальную магчымасць нам даюць велікодныя (валачобныя) песні, у якіх падаецца земляробчы каляндар селяніна і прама гаворыцца, «катораму святцу ўперад стаці».

Таксама ў розных варыянтах валачобных песень, якія прысвечаны гаспадару-земляробу, падаюцца звесткі, што Новы год не толькі пачынаўся на Раство і Вялікдзень, але і на Збор (нядзеля першага тыдня пасля Масленіцы), Аўдакею (1 сак.), Благавешчанне (25 сак.), Юр’е (23 крас.) і інш. Глядзіце далей табліцу «Частотнасць хранонімаў валачобна-паэтычнага календара» (дадаецца).

У беларускай вусна-паэтычнай творчасці фенаменальна знайшлі адлюстраванне наступныя каляндарна-фальклорныя стылі.

*Купальскі*. Летняе сонцастаянне. Багата прадстаўлены купальска-пятроўскім комплексам. У валачобных песнях, што мелі хрысціянскі ўплыў, не згадваецца язычніцкае Купалле, а фалькларызаваныя прысвяткі: Іван, Ян (24.06/7.07), Пятро, Пятрок (29.06/12.07); «Святы Іван ды памагаець…».

*Велікодны, саракоўны*. Магчыма, вясновае раўнадзенства. Адлюстраваны ў велікоднай паэзіі і абраднасці, святкаванні Саракі (9/22 сакавіка). Царкоўнае святкаванне 40 пакутнікаў адзначае падзею, якая адбылася каля 320 г.

З вясенняга раўнадзенства адзначаюць Новы год хакасцы ў Сібіры. У Буджаху (Паўднёвая Сербія) – Навалецце. Старажытныя іранцы адзначалі Новы год 21 ці 22 сакавіка.

*Пасхальны*. Пасха – першая нядзеля пасля вясенняга раўнадзенства і Поўні, якая не супадае з іудзейскай, згодна “рухомага” царкоўнага календара. Пасхальны стыль шырока выкарыстоўваўся ў XIV ст. у гарадах Германіі і, наогул, у многіх краінах Еўропы да 1567 г. Афіцыйнае адзначэнне царкоўнага святкавання пачалося з 525 г. (Нікейскі сабор).

*Зборны*. Збор, Ізбор (Зборніца) – 1-ая нядзеля Вялікага посту. У валачобных песнях часта згадваецца як першае свята года. «Святы Ізбор // Упярод ступіць…». Вядома, што ў сербаў-гранічар у Масленічнае загавенне існуе рытуал, які традыцыйна звязваецца з Навалеццем.

---

[1] Гістарычныя звесткі пра каляндарныя стылі тут і далей узяты з пазначаных крыніц.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Сакавіцкі*. 1/14 сакавіка. Аўдоцця Вясноўка (Яўдоха, Аўдоння, Аўдакей). Свята аздаблялі традыцыі Гукання вясны. У валачобках: «Аўдакея, перва святца, - // Вясна ўсходзе…». Як стыль выкарыстоўваўся ўжо ў III ст. н. э., з VI ст. – у Францыі, у рымлян – да 153 г., ва ўсходніх славян – да 1348 г. У сакавіку адзначаюць Новы год вахоўскія ханты, кеты і іншыя народы Сібіры.

*Благавешчанскі*. Благавешчанне (Дабравешчанне, Звеставанне) – 25 сакавіка / 7 красавіка. Гукалі вясну. «Благавешчанька, // Перша святка, // Жытцо рушыць…» - значыцца ў асобных велікодных тэкстах. Свята адзначалася як Пасха, якая затым была прымеркавана да 1-й вясенняй нядзелі па месяцавым календары. Благавешчанскі стыль ужываўся ў Рыме (XII і пачатку XIII ст.), у Англіі – да 1753 г., у Францыі – у IX—X стст., у Лівоніі – у XIII ст., а з XIV замяняецца раждзественскім стылем.

*Юраўскі*. Юрый (Ягорый, Юр'я-Ягор'е, Яня) – 23 красавіка / 6 мая. Стылю адпавядалі багатыя юраўскія традыцыі. «Перша святца – новае летца. // Святы Яня, боскі зданя, // Узяў ключы залатыя…» (з валачобнвй песні). У албанскіх мусульман, харватаў Сіньскай Краіны – Навалецце. Новае лета ў сярэдзіне красавіка – у будыстаў Лаоса, Кампучыі, Таіланда. Навалецце ў жывёлаводаў і качэўнікаў народаў Азіі выяўляе многія рысы з Юр'ем. Па календары Сака (паўднёвая Індыя) год пачынаецца прыблізна 12 красавіка. Магчыма, пачатак года па беларускаму задыяку.

*Зялёнасвяцкі*. Пяцідзесятніца, Троіца – 50-ты дзень па Пасцы. Аснова стылю – Сёмуха, Зялёныя сяткі, Русалле, абрады "Ваджэнння куста". У валачобных песнях яны не прадстаўлены як каляндарны стыль.

*Вераснёўскі* (візантыйскі). Стыль інтэрпрэтуецца старадаўнім святам – днём Сымона (1/14 верасня) і абрадам "Жаніцьба пасьвета" (коміна). У праваслаўным царкоўным календары яму адпавядае дзень памяці прападобнага Сімяона Столпніка (459 г.), які абазначае пачатак індыкта – царкоўнае Навалецце. У валачобных тэкстах – рэдкі прысвятак («А святы Сямён – а сявец дамоў…»). Стыль вядомы ў Італіі з візантыйскага часу. З 312 г. у Рымскай імперыі лік пачыналі з 23 верасня, а з 462 г. – з 1 верасня. Выкарыстоўваўся ў Расіі з 1493 г. (па іншых звестках яшчэ раней) да 1700 г. Каляндар Французскай рэвалюцыі пачынаўся з 22 верасня 1792 г. У ВКЛ часткова ўведзены з XII ст., а з канца XV канчаткова і ўжываўся да 1550 г. Яўрэі адзначаюць Новы год у маладзік перад восеньскім раўнадзенствам. Протаіндыйскі каляндар (III тыс. да н.э.) пачынаўся з асенняга раўнадзенства. У календарах большасці мангольскіх плямён Новы год прывязаны да раўнадзенства, да восені – у розных народаў Сібіры.

*Раждзественскі*. Раство Пана Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста (25.12 /7.01). «Святое Ражство // Упярод пашло, // Новы гадок // Павёў радок…» (з валачобнай песні. Стыль уведзены ў Рыме з IV ст. н. э., у Францыі з VIII і да канца X ст. Панаваў у краінах Еўропы з XIII ст. (у Германіі з 1364 г. да паловы XVI ст.). У XV ст. у Лівоніі выкарыстоўваўся разам з благавешчанскім стылем. Пасхалія (1523-1543) Ф. Скарыны пачынаецца з Раства.

*Студзеньскі*. 1/14 студзеня. Раждзественскі і студзеньскі стылі прымеркаваны да Каляд. Студзеньскі стыль згадваецца ў валачобных песнях: «Святое Васілле на Новы рок…». Увядзенне юліянскага календара ў 46 г. да н. э. звязана з пачаткам Новага года 1 студзеня. У Рымскай імперыі з XIII – XIV ст., у Іспаніі – з 1556 г., у Даніі і Швецыі – з 1559 г., у Францыі – з 1563 г., у Нідэрландах – з 1575 г., у Шатландыі – з 1600 г., у папскай канцылярыі і Германіі – з 1691 г., у Расіі – з 1700 г., у Венецыі – з 1797 г. Польшча і некаторыя рэгіёны ВКЛ адзначаюць Новы год 1 студзеня з 1364 г. (эра ад Нараджэння Хрыста) і з XVI ст. – праваслаўныя ВКЛ, а з 1550 г. канцылярыя княства пераходзіць ад вераснёўскага на студзеньскі стыль.

***Табліца 1***

**Частотнасць хранонімаў валачобна-паэтычнага календара**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Храналогія (вобразы і святы) | Дата ці пара (у праваслаўных і каталікоў) | Упамінанні ў томе "Валачобныя песні" ад №№ 68 па 97 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | – | % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 68 | 69 | 70 | 71 | 72 | 73 | 74 | 75 | 76 | 77 | 78 | 79 | 80 | 81 | 82 | 83 | 84 | 85 | 86 | 87 | 88 | 89 | 90 | 91 | 92 | 93 | 94 | 95 | 96 | 97 | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | 32 | 33 | 34 |
| 1.Ясень Красен | " | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 2.Ягор, Ізбор | " | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | ☼ | ☼ | | | | | ☼ | | | ☼ | | ☼ | | | | | | 12 | 40 |
| 3.Аўдакея (п) | 14 сак. | | ☼ | | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | | | ☼ | | ☼ | | | | | | | | | 10 | 33.3 |
| 4.Казімір (к) | 4 сак. | | | | | | | | | | | | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | | | | ☼ | | | | | | 4 | 13.3 |
| 5.Саракі (п) | 22/9 сак. | | | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | ☼ | | | ☼ | | ☼ | | ☼ | | | | | | | 11 | 36.7 |
| 6.Рыгор (к) | 25 сак. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | 1 | 3,3 |
| 7.Аляксей (п) | 30 сак. | | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | | | ☼ | | ☼ | | | | | ☼ | | | ☼ | | | | | | | | | | | 8 | 26.7 |
| 8.Благавешчанне, Звеставанне | 7 крас./ 25 сак. | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | | | 24 | 80 |
| 9.Вербніца, Варба | " | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | | | ☼ | ☼ | | | | | | | | ☼ | | ☼ | | | | 13 | 43.3 |
| 10.Чысты чацвер | " | | | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | | | | | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | | | | | 13 | 43.3 |
| 11.Чырвоная суб. | " | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 12.Вялікдзень, Вялічка, Пасха | ** | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | 25 | 83.3 |
| 13.Другі дзень | " | | | ☼ | | ☼ | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | ☼ | | | | | | | | | | 4 | 13.3 |
| 14.Трэці дзень | " | | | ☼ | | ☼ | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | ☼ | | | | | | | | | | 4 | 13 |
| 15.Праводніца (п) | " | | | | | | | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | 4 | 13 |
| 16.Радуніца (п) | " | | | | ☼ | ☼ | | | | ☼ | ☼ | | | | ☼ | | ☼ | ☼ | | | | | | ☼ | | ☼ | | ☼ | | | | 10 | 33,3 |
| 17.Мёрт. Радуніца | " | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 18.Юр'е, Ягор'е, Яга | 6 мая / 23 красав. | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | 28 | 93.3 |
| 19.Міколін бацька | 8 мая | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 20.Мікола (п) | 9 мая | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | 26 | 86.7 |
| 21.Барыс (п) | 15 мая | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | | ☼ | | | | | ☼ | | ☼ | | | | | ☼ | | ☼ | | ☼ | | | | 12 | 40 |
| 22.Ушэсце | " | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | | | 22 | 73.7 |
| 23. Святы дух, Сёмка | * субота | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | ☼ | | | 2 | 6.7 |
| 24.Сёмуха, Тройца | *нядз. | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | | | 19 | 63.3 |
| 25. Дзявятнік | *чацвер | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | | | | | ☼ | | | | | | 12 | 40 |
| 26.[illegible] | *пятніца | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | | | | 4 | 13.3 |
| 27.Іван, Ян | 7л./24 ч. | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | | ☼ | | | ☼ | | | | | | 16 | 53.3 |
| 28.Пятро, Пятрок | 12 л./29 ч. | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | | 25 | 83.3 |
| 29.Паўлюк, Паўла | 12 л./29 ч. | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | ☼ | | | | | 3 | 10 |
| 30.Кузьма | 14/1 ліп. | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | 5 | 16.7 |
| 31.Дзям'ян | 14/1 ліп. | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | 4 | 13.3 |
| 32.Малыя святкі | за Кузьм. | | ☼ | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | ☼ | ☼ | | | | | | | | | | | 4 | 13.3 |
| 33.Дзесятнік | *Чацвер | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | ☼ | | | | | | | | | | | ☼ | | | | 3 | 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3<br>68 | 4<br>69 | 5<br>70 | 6<br>71 | 7<br>72 | 8<br>73 | 9<br>74 | 10<br>75 | 11<br>76 | 12<br>77 | 13<br>78 | 14<br>79 | 15<br>80 | 16<br>81 | 17<br>82 | 18<br>83 | 19<br>84 | 20<br>85 | 21<br>86 | 22<br>87 | 23<br>88 | 24<br>89 | 25<br>90 | 26<br>91 | 27<br>92 | 28<br>93 | 29<br>94 | 30<br>95 | 31<br>96 | 32<br>97 | 33<br>= | 34<br>% |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 34.Дзесатуха | *Пятніца | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | | | ☼ | | | | | ☼ | | | ☼ | | ☼ | | | | 12 | 40 |
| 35.Ніцілка | *Пятніца | | ☼ | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 2 | 6.7 |
| 36.Шыпілка | *Пятніца | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 37.Ділаг (к) | 8 ліпеня | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 38.Ілля, Алляш | 2 жн/20 л. | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | 29 | 96.7 |
| 39.Барыс (п) | 6 жніўня | | | ☼ | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | | | ☼ | | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | | | | | | | | | | 8 | 26.7 |
| 40.Ганны. Ільёва жніўка | 7 жніўня /25 ліпеня | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | | | | | | | | ☼ | | | ☼ | ☼ | | | | ☼ | | | | | | 10 | 33.3 |
| 41. Макавей (г) | 14 жніўня | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | 2 | 6.7 |
| 42.Яблычны Спас | 19/6 жн. | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | 2 | 6.7 |
| 43.Прачыстая. Успленне. | 28/15 жніўня | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | 19 | 63.3 |
| 44.Спас. Спасік | 29/16 жн. | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | | ☼ | | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | | ☼ | | | ☼ | | | 15 | 52.0 |
| 45.Ян Спецдзень | 11 в/29 жн. | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 46.Сямён | 14/1 вер. | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 47.Міхайла (п) | 19 вер. | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | 2 | 6.7 |
| 48.Другая Прачыстая | 21/8 верасня | | | | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | | | | | ☼ | ☼ | | ☼ | | | ☼ | | | ☼ | | | | | | ☼ | ☼ | 12 | 40 |
| 49.Узвіжанне | 27/14 вер. | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | ☼ | | | | | ☼ | | | ☼ | ☼ | | | | | | | ☼ | | | | | | 8 | 26.7 |
| 50.Іван. Іван пакроўскі | 9 кастрычніка | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 51. Пакровы | 14 кастр. | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | 21 | 70 |
| 52.Зміцер. Зміцры | 8 ліст/26 к. | | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | | | | ☼ | ☼ | | | | ☼ | | ☼ | ☼ | | ☼ | | ☼ | | | | 10 | 33.3 |
| 53.Міхайла | 21/8 ліст. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 54.Юры, Юр'я (о) | 9 снежня | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | 2 | 6.7 |
| 55.Мікола | 19/6 снеж. | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | 2 | 6.7 |
| 56.Раство, Ражаство | 7 студзеня /25 снежня | ☼ | ☼ | | | | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | ☼ | | | | | | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | | ☼ | | | | 11 | 36.7 |
| 57. Каляды | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | ☼ | | | | 3 | 10 |
| 58.Новы год | . студз. | | ☼ | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | ☼ | | | | 4 | 13.3 |
| 59.Васілле. Н.год | 14/1 студз. | ☼ | | ☼ | | | | | | | | ☼ | | | | | | ☼ | | | ☼ | | | | ☼ | | | | | | | 6 | 20 |
| 60. Вадохрышча | 19/6 студз. | ☼ | ☼ | ☼ | | | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | ☼ | | | ☼ | ☼ | | | ☼ | | | ☼ | | | | 12 | 40 |
| 61. Іван хрысціц. | 20/7 студз. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | 1 | 3.3 |
| 62.Грамніцы | 15/2 лют. | ☼ | ☼ | | | | | ☼ | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | ☼ | | | ☼ | ☼ | | | | | | ☼ | | | | 10 | 33.3 |
| 63.Масленка | * | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | ☼ | | | | 3 | 10 |
| | (Усяго) | 19 | 27 | 33 | 23 | 31 | 19 | 16 | 14 | 33 | 22 | 19 | 8 | 11 | 16 | 18 | 21 | 36 | 9 | 5 | 29 | 20 | 16 | 19 | 11 | 24 | 6 | 22 | 11 | 6 | 5 | | |

Такім чынам, асноўныя каляндарныя святы, што насычаны паэзіяй і абрадамі, у мінулым былі Навалеццямі, прадстаўлялі адпаведны каляндарны стыль, служылі справе аптымальнага пошуку сродкаў летазлічэння.

| *Месца запісу* | | 68 | 69 | 70 | 71 | 72 | 73 | 74 | 75 | 76 | 77 | 78 | 79 | 80 | 81 | 82 | 83 | 84 | 85 | 86 | 87 | 88 | 89 | 90 | 91 | 92 | 93 | 94 | 95 | 96 | 97 | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Барыс. г. Мінскай | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | 2 | |
| Барыс. р. Мінскай | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | 2 | |
| Вілейскі павет | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | 1 | |
| Барысаўскі р. Мін. | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | |
| Лепельскі г. Віц. | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | 2 | |
| Лепельскі р. Віц. | | | | | | | | | | ☼ | ☼ | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 3 | |
| Верхнядзвінскі р. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | 1 | |
| Дзісенскі г. Віцеб. | | | | | ☼ | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | 3 | |
| Міёрскі р. Віцебс. | | | | | | | ☼ | | | | | | | | ☼ | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | 3 | |
| Полацкі р. Віцебс. | | | | | | | | | ☼ | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1 | |
| Браслаўскі р. Віц. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | | | | | 1 | |
| Глыбоцкі павет | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | | 1 | |
| Себежскі п. Віцеб. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | | 1 | |
| Веліжскі г. Віцеб. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | | | 1 | |
| Сенненскі п. Маг. | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | | | | | 1 | |
| Бабруйскі павет | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | ☼ | 1 | |
| | | 68 | 69 | 70 | 71 | 72 | 73 | 74 | 75 | 76 | 77 | 78 | 79 | 80 | 81 | 82 | 83 | 84 | 85 | 86 | 87 | 88 | 89 | 90 | 91 | 92 | 93 | 94 | 95 | 96 | 97 | | |

*Не мае сталага месца ў календары, залежыць ад даты адпаведнай хрысціянскай Пасхі.
**Пэўная нядзеля ў царкоўнай пасхаліі ў перыяд з 4 красавіка па 8 мая ў праваслаўных і з 22 сакавіка па 25 красавіка ў католікаў.
҉ Хранонім, які пачынае гадавое кола.
☼ Хранонім (або агіонім) – свята ці прысвятак, якія ўпамінаецца ў песні.
П – хранонім праваслаўнага паходжання, к – каталіцкага.

**Спіс літаратуры:**


1. Лозка, А. Ю. Феномен каляндарных стыляў беларускага фальклору / А. Ю. Лозка // Праблемы ўсходнеславянскай этналінгвістыкі : матэрыялы I міжнар. навук. канф., Мінск, 25–26 красав. 2003 г. – Мінск : УП «Тэхнапрынт», 2003. – С. 146–152.
2. Лозка, А. Ю. Феномен Новага года ў беларускім фальклоры : манаграфія / А. Ю. Лозка. – Мінск : БДПУ, 2004. – 165 с.
3. Климишин, И. А. Календарь и хронология / И. А. Климишин. – 3-е изд. – М. : Наука, 1990. – 477 с.
4. Календарь в культуре народов мира : сб. ст. – М. : Вост. лит., 1993. – 272 с.
5. Пронштейн, А. П. Хронология : учеб. пособие / А. П. Пронштейн, В. Я. Кияшко. – М. : Высш. шк., 1981. – 191 с.
6. Горбачевский, Н.И. Археографический календарь на две тысячи лет (325—2324) по Юлианскому исчислению и на семсот сорок два года (1583–2324) по Григорианскому счислению / сост. Н. Горбачевским. – Вильна : Тип. А. С. Сыркина, 1869. – 110 с.
7. Валачобныя песні / уклад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ